# Адданасць роднай зямлі

**У Рубяжэвічах – знакамітай на Міншчыне вёсцы – Сабалеўскіх ведаюць усе. Дзе знаходзіцца іх сядзіба, тут пакажа кожны і абавязкова пры гэтым падкрэсліць, што застаць гаспадароў дома – вялікая рэдкасць. Тадэвуш Люцыянавіч, галава сям'і, і Рамуальда Ігнатаўна, яго жонка, – людзі няўрымслівыя, адданыя сваёй малой радзіме, таму заўсёды клапоцяцца пра сваю вёску і асабліва пра яе гістарычную аздобу. Гэта іх рупнасцю і стараннем Рубяжэвічы сёння маюць адметнае аблічча, якое прыцягвае аматараў мінуўшчыны не толькі з усёй Беларусі, але і з блізкага і далёкага замежжа.**

## Рамуальда і Тадэвуш



Рамуальда Ігнатаўна Сабалеўская

З Рамуальдай Ігнатаўнай мы па тэлефоне дамовіліся сустрэцца ў мясцовай школе. Там яна выкладае рускую мову і літаратуру ўжо не адзін дзясятак гадоў. Працуе старанна, з агеньчыкам. Яе вучні прадмет свой любяць, а лепшыя з іх дабіваюцца поспехаў у прадметных алімпіядах рознага ўзроўню.

Аднак ёсць у Рамуальды Ігнатаўны і яшчэ адна вельмі важная для яе справа. Усё сваё жыццё збірае згадкі пра мінуўшчыну роднай вёскі. Спачатку, як расказвае, гэта былі матуліны ўспаміны, пасля – расказы суседзяў, сваякоў, а затым – жыццёвыя споведзі сталага веку аднавяскоўцаў і жыхароў навакольных вёсак. Розныя гэта былі аповеды, але менавіта з іх пакрысе, цаглінка за цаглінкай, выбудоўвалася гісторыя роднай вёскі, многія старонкі якой Р. Сабалеўская, знайшоўшы сабе аднадумцаў, найперш у асобе мужа, і захацела аднавіць.



Тадэвуш Люцыянавіч Сабалеўскі

Тадэвуш Люцыянавіч таксама мясцовы. Не паддаўся ў свой час спакусе змяніць вясковае жыццё на гарадское, пасля заканчэння Маладзечанскага музычнага вучылішча вярнуўся на малую радзіму, якой затым і прысвяціў свае таленты. Працаваў у мясцовым Доме культуры, доўгі час быў яго дырэктарам, заснаваў і кіраваў дзіцячым духавым аркестрам «Няшота». Менавіта пад яго кіраўніцтвам аркестр атрымаў ганаровае званне ўзорнага калектыву.

Як прызнаецца Тадэвуш Люцыянавіч, рубяжэвіцкая зямля яго не толькі ўзгадавала, але і сілкуе сваёй незвычайнай энергетыкай. Ён выдатна спявае, іграе на многіх музычных інструментах – духавых, акардэоне, клавесіне, піяніна. Нядаўна набыў рэдкі старадаўні народны інструмент дуду. Тадэвуш Сабалеўскі – сэрца музычнага ансамбля, у якім іграюць і пад акампанемент выконваюць польскія песні члены яго сям'і і блізкія родзічы. У рубяжэвіцкіх ваколіцах Тадэвуш Люцыянавіч адзіны, каму падуладны старадаўні арган, што знаходзіцца ў мясцовым касцёле. Іграе не толькі падчас касцельнай службы, але і турыстам, якія прыязджаюць у Рубяжэвічы. Тадэвуш Люцыянавіч заўсёды рады падарыць прыемныя хвіліны яднання з велічнай арганнай музыкай.

Рамуальда Ігнатаўна стала яго вернай спадарожніцай жыцця. У іх пяцёра дзяцей, якія таксама, як і бацькі, сэрцам адданыя роднай зямлі. Нягледзячы на тое, што некаторыя з малодшых Сабалеўскіх звязалі лёс са сталіцай, Рубяжэвічы для іх – мясціна, куды заўсёды імкнуцца ў вольную часіну і якую разам са сваімі маці і бацькам стараюцца зрабіць прыгажэйшай.

## Памяць у камені

Галоўнай славутасцю Рубяжэвічаў, бясспрэчна, з'яўляецца касцёл Святога Юзафа. Збудаваны ў неагатычным

стылі з абчэсанага каменю, ён велічна ўзвышаецца над вёскай і робіць краявід больш прывабным і радасным для вока. Гэту вясковую святыню Р. Сабалеўская, як, зрэшты, і ўсе мясцовыя жыхары, незалежна ад веравызнання, любіць асабліва. Пра гісторыю храма, яго архітэктурныя адметнасці, аздобу, інтэр'ер, як і пра розныя звязаныя з ім цікавыя звесткі мая суразмоўца можа расказваць, здаецца, бясконца і вельмі захапляюча, на адным дыханні.

– Наш касцёл адносна іншых унікальных культавых пабудоў Беларусі яшчэ малады: яму толькі крыху больш за сто гадоў, – гаворыць Рамуальда Ігнатаўна. – А вось гісторыя яго з'яўлення вельмі цікавая. Першапачаткова ў 1799 годзе ў Рубяжэвічах быў узведзены невялікі драўляны касцёл Святога Антонія. Ён, як кажуць, верай і праўдай служыў нашым прашчурам да другой паловы XIX стагоддзя. Але пасля паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага ўрад Расійскай імперыі ў ліку іншых мер, накіраваных на задушэнне бунтарскага духу на тэрыторыі сучаснай Беларусі, павёў наступ на каталіцызм. У выніку касцёл у Рубяжэвічах быў адабраны ў вернікаў і пераасвячоны ў царкву, нягледзячы на тое, што ў мястэчку ўжо існаваў праваслаўны храм. Аднак большая частка рубяжоўцаў-католікоў катэгарычна не пажадалі пераходзіць у праваслаўе. Больш таго, у каталіцкай грамадзе стаў шырыцца рух за пабудову ў вёсцы новага касцёла. Завадатарам гэтай справы быў рубяжэвіцкі мешчанін Антоній Тур. Ён некалькі разоў пісаў прашэнні да расійскага імператара Аляксандра II аб дазволе на будаўніцтва ў Рубяжэвічах каталіцкага храма, тройчы наведваўся ў Санкт-Пецярбург, каб уласнаручна перадаць петыцыю ў царскую канцылярыю. Аднак дазволу так і не далі. Тым не менш Антоній не страціў надзеі. Ён выбраў у наваколлі з плоскім бокам валун, перавёз яго на пясчаны пагорак на ўскраіне мястэчка і выбіў на тым камені надпіс, што ў гэтым месцы будзе пабудаваны касцёл рымска-каталіцкай веры. Праўда, дорага каштаваў той учынак усёй сям'і Тура: іх



Частка мемарыяла «Памяць у камені» на фоне касцёла Святога Юзафа ў Рубяжэвічах

саслалі ў Сібір. У ссылцы Антоній прабыў сем з дванаццаці прызначаных судом гадоў. А калі па амністыі вярнуўся дадому, адразу ж прадоўжыў сваё змаганне за касцёл. І нарэшце атрымаў-такі дазвол на яго будаўніцтва. Праўда, з умовай – кіравацца ўказаннямі мінскага губернатара. А той, каб ускладніць рубяжоўцам задачу, запатрабаваў узводзіць храм толькі з чэсанага каменю і вызначыў вельмі сціслы для такой будоўлі чатырохгадовы тэрмін...

Драматычная гісторыя з'яўлення храма перадаецца ў Рубяжэвічах з пакалення ў пакаленне. Магчыма, і не ўсе дэталі тут дакладныя. Але Антоній Тур, як запэўнівае Рамуальда Ігнатаўна, – рэальны чалавек. Яго нашчадкі цяпер жывуць у Польшчы і часам наведваюцца ў вёску, цікавяцца справамі ў касцёле. Дый той самы камень, празваны рубяжоўцамі «каменем Тура», са сваім арыгінальным надпісам дагэтуль ляжыць каля параднага ўвахода ў касцёл Святога Юзафа, нагадваючы пра падзеі даўно мінулых дзён.

– Дазвол на ўзвядзенне храма рубяжэвіцкія каталікі атрымалі ўжо ад іншага расійскага імператара – Мікалая II, – працягвае Р. Сабалеўская. – Ён быў выдадзены ў 1905 годзе пасля выхаду царскага



▲ Цэнтральная частка мемарыяла «Памяць у камені»

ўказа аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці. Касцёл і на самай справе пабудавалі за чатыры гады. Гэта здаецца неверагодным, калі ўлічыць, што механічных пад'ёмных кранаў і тэхнікі для перавозу валуноў тады не існавала. Пачалася будоўля ў 1906 годзе, і штодня на ёй працавалі да ста чалавек, палова з якіх былі каменячосамі. Замест цэментнага раствору выкарыстоўвалася сумесь вапны, кіслага малака і курыных яек. Фінансавыя сродкі на будаўніцтва збіралі з вернікаў, жыхароў Рубяжэвічаў і навакольных вёсак. Істотны ўклад у гэтую высакародную справу – 15 тысяч тагачасных рублёў – унеслі і Ленскія, уладальнікі суседняга з мястэчкам маёнтка Сула. Дасылалі грошы і многія ўраджэнцы вёскі, што падаліся ў эміграцыю ў Злучаныя Штаты Амерыкі ці выехалі за мяжу на заробкі. Вось так, усёй грамадой і збудавалі нашы продкі свой велічны касцёл. Першая служба ў ім прайшла ў 1910 годзе. На жаль, Антоній Тур да таго часу не дажыў…

Цікава, але быццам вышэйшыя сілы апекавалі новы рубяжэвіцкі касцёл. Ён ніколі не зачыняўся. А вось стары драўляны касцёл Святога Антонія, які каталікі вярнулі сабе ў 1920-я гады, напаткаў сумны лёс. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў ім размяшчаўся клуб, затым – збожжасховішча. А ў сярэдзіне 1970-х гадоў старадаўні будынак і наогул разабралі. На тым месцы цяпер жывуць людзі. Аднак памяць пра касцёл Святога Антонія ў Рубяжэвічах не сцерлася. Па ініцыятыве Сабалеўскіх у яго гонар быў адкрыты помнік: вялізны 4-мятровы крыж, які вырабіў Тадэвуш Люцыянавіч. Там жа выкладзены ў форме сэрца камяні, якія сімвалізуюць збалелае сэрца вернікаў. Побач з крыжам устаноўлена мураваная крапільніца – адзіная рэліквія, якая захавалася ад старога рубяжэвіцкага каталіцкага храма. Яе, калі разбіралі будынак, нехта з вяскоўцаў прыхаваў – падкаціў пад рог хаты і такім чынам збярог для нашчадкаў.

Усталёўваць памятны знак дапамагалі Сабалеўскім аднавяскоўцы, падтрымалі добрую справу і аказалі неабходнае садзейнічанне старшыні мясцовых сельсавета і сельгаспрадпрыемства. У чэрвені 1999 года, акурат на 200-годдзе парафіі, якая, дарэчы, носіць сваё спрадвечнае найменне – Святога Антонія, з гэтай нагоды адбыўся хрэсны ход. Сваю новую вясковую славутасць рубяжоўцы адкрывалі таксама ўсе разам: урачыста, з пашанай і падзякай руплівцам.

Да 100-годдзя пачатку будаўніцтва касцёла Святога Юзафа, у 2006 годзе, у Рамуальды і Тадэвуша Сабалеўскіх наспела яшчэ адна ініцыятыва – стварыць своеасаблівы музей камянёў. Такім чынам яны вырашылі ўвекавечыць памяць аб усіх 43 вёсках, жыхары якіх з'яўляюцца парафіянамі рубяжэвіцкага каталіцкага храма.

– Нашу ідэю размясціць перад будынкам мемарыял з назвамі паселішчаў падтрымаў тагачасны пробашч касцёла, ужо светлай памяці ксёндз-дэкан Рычард Юнік, – уключаецца ў размову Тадэвуш Люцыянавіч. – На касцельным савеце абмеркавалі ўсе дэталі задуманага праекта, пасля чаго прапанавалі далучыцца да яго ажыццяўлення ўсім жадаючым. Ахвотна падтрымалі нас і кіраўнікі чатырох сельгаспрадпрыемстваў Стаўбцоўскага раёна, на тэрыторыі якіх размешчаны гэтыя вёскі. Жыхары кожнай з іх прывезлі свой камень. І выбіралі, каб менавіта іх

валун быў прыгажэйшы за іншыя. Здаралася, прывозілі каменную камлыгу, а пасля забіралі назад, бо на фоне іншых яна выглядала несамавіта. Тады шукалі больш прыдатны камень.

Калі ў Рубяжэвічы была прывезена неабходная колькасць валуноў, на кожным з іх мы выбілі назву канкрэтнай вёскі. Праблема ўзнікла толькі з вёскай Васілеўшчына. Справа ў тым, што спрадвеку гэтае паселішча называлася Жыдавічы, і якраз на ім настойвала большасць жыхароў. Аднак мы пайшлі на кампраміс, змясціўшы на камені новую і старую назвы вёскі. На вялікія рэлігійныя святы, калі ўраджэнцы навакол-рубяжэвіцкіх паселішчаў з'язджаюцца на малую радзіму, яны прыходзяць да «сваіх» камянёў, запальваюць лампады, памінаюць родных...

Але наш расказ пра памяць, зафіксаваную ў камені, быў бы няпоўны без згадкі пра яшчэ адзін адметны праект. Як расказвае Рамуальда Ігнатаўна, незайздросны лёс касцёла Святога Антонія напаткаў і рубяжэвіцкую царкву Мікалая Цудатворца – яна таксама была знішчана. На яе месцы ўзвялі будынак мясцовага сельсавета. У 2000 годзе праваслаўныя вернікі пабудавалі ў вёсцы новы храм, але не знікла памяць і пра стары.

– Сэрца і розум падказвалі: месца, дзе была старая царква, павінна быць пазначана невялікім мемарыялам, – успамінае Р. Сабалеўская. – У думках і на паперы від гэтага знака бачыўся так: камень, а на ім крыж, што быў калісьці скінуты з купала царквы. Побач яшчэ адзін камень – сімвал знішчаных могілак, якія існавалі пры царкве. Нашым аднадумцам у гэтай справе стаў айцец Мікалай. І мясцовыя ўлады падтрымалі ідэю і дазволілі «жыць» памятнаму знаку, за што вялікая падзяка былой старшыні сельскага Савета Але Стралкоўскай. Былы дырэктар ААТ «Рубяжэвічы» Андрэй Атрушкевіч, а таксама вяскоўцы Анатоль Каразей, Мікалай Бондар, Віталь Дубінец дапамаглі вырашыць пытанні з тэхнічнага боку. Сям'я Дымаў удзельнічала ў аздабленні. Асноўную справу ад пачатку да завяршэння вёў Тадэвуш Сабалеўскі.

Калі адбылося асвячэнне гэтага месца і перапахаванне астанкаў, што былі знойдзены падчас правядзення земляных работ, сабраліся разам праваслаўныя і каталікі, разам маліліся. Малітва і цішыня... Кожны думаў аб сваім, аднаўляў у думках свой радавод…

## Купалавы карані

– Ведаеце, Стаўбцоўшчына ж магла стаць малой радзімай і яшчэ аднаго беларускага песняра – Янкі Купалы, бо каля Рубяжэвічаў жылі яго продкі, – зазначае Рамуальда Ігнатаўна. – Але лёс распарадзіўся крышачку інакш: шляхі-дарогі прывялі бацькоў будучага паэта ў Вязынку, дзе і наканавана было нарадзіцца будучаму паэту…

А чаму так адбылося, мая суразмоўца ведае не па чутках, а па архіўных крыніцах. Справа ў тым, што яшчэ ў XVII стагоддзі продкі Я. Купалы валодалі на абсягах цяперашняй Стаўбцоўшчыны значнымі зямельнымі надзеламі. Як сведчыць «Справа Мінскага дэпутацкага сходу пра шляхецкае паходжанне роду Луцэвічаў», што захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве ў Мінску, Станіслаў Луцэвіч, якога прынята лічыць заснавальнікам паэтавага роду, чатыры стагоддзі таму валодаў «на вотчынным праве маёнткам Кукляўшчына, з вёскамі Слабодкаю і Цярпілаўкаю, з сялянамі, у Мінскім ваяводстве». Па тагачасных мерках, даволі значная маёмасць. Аднак нашчадкі не змаглі захаваць гэтыя ўладанні: спачатку яны іх раздрабнілі, падзяліўшы на долі, а затым і наогул папрадавалі. Адбывалася гэта ў 1780-я гады. Пасля прадзед паэта Дамінік Луцэвіч пераехаў у Лазараўшчыну – невялікі засценак на тэрыторыі цяперашняй Уздзеншчыны, паблізу вёскі Забалацце. На той час гэта быў адзіны кавалак колішняй вялікай маёмасці, якая заставалася ў распараджэнні прадстаўнікоў роду. Дарэчы, менавіта ў Лазараўшчыне нарадзіўся Дамінік Луцэвіч – бацька будучага народнага паэта.

З-за малазямелля сям'і жыццёвы шлях Дамініка Луцэвіча быў вельмі пакруча-

сты. Ён шмат працаваў на арандаванай зямлі, падоўгу не затрымліваючыся на адным месцы. І прыкладна ў 1878 годзе лёс наканаваў яму трапіць у ваколіцы Рубяжэвічаў, у невялікі фальварак Няшота. Там, у сям'і заможных шляхціцаў Валасевічаў, 32-гадовы Дамінік Луцэвіч і прыгледзеў адну з дзвюх гаспадаравых дачок – Бянігну. Дзяўчыне таксама запаў у душу сталы, прыгожы і шляхетны мужчына. Аднак іх каханню і тым больш магчымаму сямейнаму саюзу запрацівіліся бацькі Бянігны: яны катэгарычна не жадалі, каб іх дачка зналася з беззямельным.

І ўсё ж, моцна пакахаўшы Дамініка, 21-гадовая Бянігна адважваецца на свавольны ўчынак: у 1879 годзе яна насуперак волі бацькоў бярэ шлюб з Дамінікам Луцэвічам і пакідае Няшоту. Старыя Валасевічы адразу ж парвалі ўсялякія адносіны з няўдзячнай дачкою. Нягледзячы на гэта, Бянігна і Дамінік жылі шчасліва, у каханні і згодзе. Адразу пасля вянчання яны знайшлі сабе куток у Раговічах (цяперашні Мінскі раён), затым ім удалося ўзяць у арэнду непадалёку ад Ракава фальварак Паморшчына. І толькі ў 1881 годзе сям'я пераехала ў Вязынку, дзе праз год і нарадзіўся ў іх першынец. Назвалі хлопчыка Іванам, ці, на шляхецкі манер, Янам – у гонар дзеда, старога Валасевіча.

– Па ўсім відаць, пасля таго, як у Няшоту прыйшла радасная вестка аб нараджэнні ўнука, Валасевічы ўсё ж даравалі дачцэ яе «неабдуманы» ўчынак і аднавілі зносіны з яе сям'ёй, – мяркуе Р. Сабалеўская. – Зыходзячы з гэтага, можна сцвярджаць, што ў сваім малалецтве і, магчыма, нават у дзяцінстве будучы народны паэт Беларусі разам з бацькамі наведваў радзіму сваёй маці, гасцяваў у дзядулі з бабуляй у Няшоце, бываў і ў Рубяжэвічах…

Паводле слоў Рамуальды Ігнатаўны, Я. Купала падтрымліваў сувязі са сваякамі па матчынай лініі і пазней. Прынамсі, пра гэта сведчыць той факт, што ў жніўні 1913 года ён разам з сястрой Леакадзіяй прыязджаў у Няшоту. Паэт тады гасцяваў у бабулі Кацярыны, праведваў сваіх дзядзькоў Антося, Францішка і Міхала, цікавіўся жыццём мясцовых сялян. Радзіннае гняздо сваіх продкаў неаднойчы ўшаноўвала сваёй прысутнасцю і маці народнага песняра. Так, дакладна вядома, што ў хуткім часе пасля асвячэння рубяжэвіцкага касцёла Бянігна Луцэвіч прыязджала ў родныя мясціны, наведвала храм і падаравала мясцовым вернікам копію абраза Маці Божай Вастрабрамскай, якая і па сённяшні дзень з'яўляецца неад'емнай часткай інтэр'ера згаданай каталіцкай святыні.

Мінулы ад тых падзей час, вядома ж, наклаў свой адбітак на тамтэйшыя мясціны. У 1949 годзе былы фальварак Няшота быў аб'яднаны з суседнім паселішчам у адну вёску пад назвай Ручына. Прыкладна ў той час у Рубяжэвічах арганізаваўся калгас, і местачкоўцы, многія з якіх памяталі пра прыезд у Няшоту Янкі Купалы, назвалі сваю гаспадарку імем народнага паэта. Дзесьці ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гадоў у Ручыне была разабрана і перавезена ў недалёкую вёску Русакі і хата, дзе да вайны жылі Купалавы сваякі, а яшчэ раней – і бабуля Кацярына Валасевіч. На новым месцы ў будынку, які памятаў маладога паэта, зрабілі школу-васьмігодку: праіснавала яна да сярэдзіны 1990-х гадоў.

Тады і нарадзілася ў захавальнікаў гістарычнай спадчыны рубяжэвіцкага наваколля Рамуальды і Тадэвуша Сабалеўскіх задума перавезці будынак назад і абсталяваць краязнаўчы музей. У ім, вядома ж, знайшлося б месца і матэрыялам пра продкаў Я. Купалы як па мацярынскай, так і бацькоўскай лініі – тых, хто калісьці жыў у Кукялёўшчыне і Цярпілаўцы (сучасная вёска Драздоўшчына) і ў Слабодцы, дзе, дарэчы, пра гэты факт няма ніякага знака, і асабліва пра паэтаву маці Бянігну Луцэвіч, ад якой, як вядома, беларускі пясняр «навучыўся… слоў беларускіх… і дум беларускіх без школы і кніг».

Як і любому добраму грамадскаму пачынанню, ініцыятыве Сабалеўскіх не хапала фінансавай падтрымкі. Аднак яны не апусцілі рукі, вырашылі пачаць з найменш затратнага праекта – увекавечання памяці пра былое радавое гняздо продкаў

песняра. Звярнуліся ў аддзел культуры Стаўбцоўскага райвыканкама і ў асобе тагачаснага яго загадчыка Анатоля Васільевіча Грэкава знайшлі паразуменне. Разам і рупіліся, каб у Ручыне на месцы, дзе стаяла хата Купалавых продкаў, быў устаноўлены мемарыяльны камень. У рамках той урачыстасці, якая набыла агульнараённы маштаб, арганізавалі і літаратурнае Купалаўскае свята з удзелам беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Мінула некалькі гадоў, і Сабалеўскія наладзілі яшчэ адно ўрачыста-святочнае мерапрыемства ў гонар сваякоў Я. Купалы па мацярынскай лініі. На гэты раз яно адбылося ў Рубяжэвічах. Спачатку на сваце сваёй вёскі, а затым і на імшы ў мясцовым касцёле жыхары старадаўняга мястэчка ўшанавалі памяць роду Валасевічаў, што даў Беларусі нацыянальнага генія Янку Купалу. Візуальным жа вынікам той урачыстасці сталі два памятныя валуны, устаноўленыя на адных з рубяжэвіцкіх могілак (іх у вёсцы некалькі) перад уваходам. Надпісы на іх сведчаць, што там знайшлі свой вечны спачын продкі беларускага песняра. Дарэчы, праз некаторы час вучні Рубяжэвіцкай сярэдняй школы разам з Рамуальдай Ігнатаўнай адшукалі магілы многіх прашчураў паэта, пахаваных там, і ўзялі на сябе клопат па доглядзе месцаў іх апошняга прытулку. На падставе атрыманых такім чынам звестак быў складзены падрабязны радавод Я. Купалы па лініі маці. Ім зацікавіліся і далёкія сваякі беларускага песняра, якія жывуць у Польшчы.

Што ж датычыцца ідэі Сабалеўскіх наконт музея Купалавага роду, то яна не ажыццявілася. У будынка былой школы ў Русаках з'явіліся новыя гаспадары, якія пакуль не жадаюць ісці на ўступкі. Але ініцыятары гэтай добрай справы разлічваюць на разуменне з боку аднавяскоўцаў, наглядальніцкага савета мясцовага ААТ «Рубяжэвічы», раённых улад, мецэнатаў і цвёрда вераць, што задуманае рана ці позна здзейсніцца. Тым больш што некалькі гадоў таму агульнымі намаганнямі падмурак пад будучы музейны аб'ект быў ужо закладзены.



▲ Музей яўрэйскага побыту ў Рубяжэвічах

## Яўрэйская старонка

Спакон веку Рубяжэвічы былі шматканфесіянальным паселішчам. Тут побач з беларусамі жылі палякі, яўрэі. Адпаведна ў вернікаў былі свае святыні – царква, касцёл, сінагога. Як расказвае Рамуальда Ігнатаўна, у даваенны час тут жыло каля 2 тысяч яўрэяў. У Вялікую Айчынную вайну іх напаткаў трагічны лёс. Нямецка-фашысцкія акупанты стварылі ў вёсцы гета, куды сагналі ўсіх сваіх будучых ахвяр. Праўда, асаблівай работы ў мястэчку для вязняў не было, таму гітлераўцы прынялі рашэнне зменшыць колькасць насельнікаў рубяжэвіцкага гета. Яны правялі своеасаблівы адбор – мужчын і юнакоў накіравалі ў канцэнтрацыйны лагер, створаны ў вёсцы Дварэц Дзятлаўскага раёна, дзе яны будавалі аэрадром, жанчын і дзяўчат – у гета пасёлка Івянец. У Рубяжэвічах пакінулі толькі старых і дзяцей, якіх – 360 чалавек – пазверску забілі 9 чэрвеня 1942 года ва ўрочышчы Лаза непадалёк ад вёскі.

«Шлях смутку» – такая шыльдачка пазначае сёння дарогу, якую апошні раз у сваім жыцці прайшлі рубяжэвіцкія пакутнікі. Адразу пасля вайны вяскоўцы па ініцыятыве загадчыка мясцовай аптэкі Станіслава Вількоцкага паставілі на месцы расстрэлу сціплы помнік.



▶ Частка экспазіцыі Музея яўрэйскага побыту

У 2001 годзе, дзякуючы стараннямі ураджэнца Рубяжэвічаў, цяперашняга жыхара Ізраіля Міхаіла Абрамавіча Белкіна, быў устаноўлены новы мемарыял ахвярам рубяжэвіцкага гета. Пры гэтым стары рушыць не сталі – так і стаяць яны, два помнікі, побач. Шэфствуюць над імі і прыбіраюць навакольную тэрыторыю вучні Рубяжэвіцкай сярэдняй школы. І даволі часта групку школьнікаў-валанцёраў прыводзіць сюды менавіта Рамуальда Ігнатаўна.

– Пра колішняе жыццё яўрэяў у Рубяжэвічах ёсць яшчэ некалькі пазнак, – гаворыць Р. Сабалеўская. – Найперш гэта – могілкі, на якіх яны на працягу чатырох стагоддзяў знаходзілі вечны спачын. Зараз гэта месца мае адпаведны свайму статусу выгляд. А было яно, няма чаго граху таіць, занядбанае, здаралася, што туды траплялі не толькі гусі-куры, але нават свойская жывёла. Пасля ўстаноўкі Міхаілам Абрамавічам новага мемарыяла на месцы расстрэлу ахвяр гета, мы задумаліся аб тым, каб добраўпарадкаваць і яўрэйскія могілкі. Спачатку зрабілі некалькі працоўных дэсантаў са школьнікамі. А затым на нас выйшаў старшыня міжнароднага грамадскага аб'яднання Voluntas Франклін Шварц, які прапанаваў садзейнічанне ў нашай справе. Так зарадзіўся сумесны дабрачынны праект па добраўпарадкаванні могілак. У 2008 годзе нам на дапамогу прыехалі 15 студэнтаў і 4 выкладчыкі каталіцкага ўніверсітэта Siena cjllege з горада Олбані, сталіцы амерыканскага штата Нью-Ёрк. Сярод іх, а гэта былі не самыя багатыя студэнты, не было ніводнага яўрэя, дый прыехалі яны, каб папрацаваць разам з намі, на свае сродкі. Мы знайшлі і паставілі вертыкальна 120 старых помнікаў. Ачысцілі тэрыторыю ад зараснікаў і пустазелля. З аднаго боку ўсталявалі мураваную агароджу. Тадэвуш Сабалеўскі пабудаваў з бутавага каменю арыгінальную ўваходную браму. Трэба адзначыць, што дапамагалі амерыканцам і мясцовыя жыхары. Вядома, усё за адзін раз зрабіць не ўдалося. Працы шмат, і мы працягваем сваё шэфства над яўрэйскімі могілкамі – пастаянна абкошваем іх тэрыторыю, усталявалі агароджу яшчэ з двух бакоў, а сёлета плануем поўнасцю завяршыць яе ўзвядзенне…

У час нашай гаворкі не абмінула Рамуальда Ігнатаўна і апошнюю навіну – у сярэдзіне лютага ў Рубяжэвічах іх сям'ёй быў адкрыты музей яўрэйскага побыту. Паводле слоў суразмоўцы, ідэя яго стварэння наспела даўно: з былой вялікай яўрэйскай забудовы цудам ацалеў у цэнтры вёскі невялікі дом. Яго Сабалеўскія і вырашылі прыстасаваць пад музейны аб'ект. Аднак паўстала маёмаснае пытанне, вырашыць якое – набыць пабудову ва ўласніка – дапамог фундатар, уладальнік парка-музея інтэрактыўнай гісторыі «Сула» Андрэй Запольскі, таксама неабыякавы да рубяжэвіцкай мінуўшчыны чалавек. Але, калі ўсе юрыдычныя фармальнасці былі ўладкаваны, выявілася, што з-за сваёй збуцвеласці пабудаваны ў канцы XIX стагоддзя будынак не зможа выконваць музейныя функцыі. Тады было вырашана яго разабраць і ўзвесці на тым месцы новы – дакладную копію. За гэтую справу ўзяўся, паклікаўшы на дапамогу сыноў і сваякоў, майстар на ўсе рукі Тадэвуш Сабалеўскі.

– Талакой добра і бацьку біць, – жартуе Тадэвуш Люцыянавіч. – З пастаўленай мэтай усе разам мы справіліся за нейкія паўгода. Рамуальда Ігнатаўна адказва-

ла ў нас за ўнутранае ўбранне будучага музея. Многа экспанатаў сабрана раней, на працягу не аднаго дзесяцігоддзя. А як аднавяскоўцы прачулі пра тое, што ствараецца музей яўрэйскага побыту, то сталі прапаноўваць рэчы, якія ў іх зберагліся. Прычым выключна аўтэнтычныя – пасля знішчэння гета яўрэйскія хаты пэўны час пуставалі, таму побытавыя рэчы, мэблю, інвентар вяскоўцы разабралі. І зараз вярнулі назад…

Трэба прызнаць, экспазіцыя рубяжэвіцкага музея ўражвае: ажно не верыцца, што так багата старадаўніх рэчаў магло дайсці да нашых дзён. Музейны інтэр'ер Сабалеўскія стваралі згодна з успамінамі аднавяскоўцаў, а таксама былых жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці, якія за заходнебеларускім часам выехалі ў пошуках лепшай долі ў ЗША, Канаду і іншыя краіны і тым самым пазбеглі трагічнага лёсу пакутнікаў гета. Дарэчы, у Рубяжэвічы і да гэтага даволі часта прыязджалі іх нашчадкі, каб пабачыць, дзе нарадзіліся і жылі дзяды і прадзеды. Цяпер жа, як гаворыць Тадэвуш Люцыянавіч, у іх ёсць яшчэ і магчымасць убачыць рэчы побыту сваіх продкаў.

Рамуальда Ігнатаўна таксама ў захапленні ад свайго новага тварэння, таму, відаць, і дзеліцца чарговай ідэяй:

– Не так даўно ў Рубяжэвічы прыязджала вядомая амерыканская харэограф Джэсіка Ланг. Яе карані адсюль, з нашых Рубяжэвічаў. У размове з ёй зайшла гаворка пра тое, што ў Ізраілі ў 1970-я гады была выдадзена кніга пра нашу вёску. І Джэсіка здзівілася, што мы яе не маем, паабяцала вырашыць гэтую праблему. І стрымала слова: вось яно, тое самае рэдкае выданне – «Мемарыяльная кніга Рубяжэвічаў» называецца. Але ў нас узнікла яшчэ адна праблема – пакуль нам не па кішэні пераклад гэтага больш як 500-старонкавага выдання, як нам прапануюць у Мінску, па 2 долары за старонку…

Рамуальда Ігнатаўна па-ранейшаму ўпэўнена, што не ўсё ў жыцці вымяраецца грашыма, і цвёрда верыць – пройдзе час, і «Мемарыяльная кніга Рубяжэвічаў» абавязкова будзе перакладзена. А гэта значыць, у экспазіцыі музея яўрэйскага побыту з'явяцца новыя раздзелы, а таксама прыадчыніцца заслона часу і над іншымі старонкамі рубяжэвіцкай мінуўшчыны.

А іх, гістарычных старонак, якія хацелі б разгадаць Сабалеўскія, яшчэ даволі шмат. Напрыклад, многа цікавага могуць расказаць падзеі 1920–1930-х гадоў, калі Рубяжэвічы тэрытарыяльна адносіліся да Польшчы. Тады ў мястэчку размяшчалася польская памежная ахова, побач праходзіла мяжа, існавала неабходная пагранічная інфраструктура… Дый падзеі верасня 1939-га пакінулі тут след: у баі, які разгарнуўся паміж савецкім вайсковым падраздзяленнем і корпусам аховы памежжа загінула некалькі польскіх пагранічнікаў і савецкіх салдат. Устанавіць прозвішчы і ўзнавіць помнік загінулым чырвонаармейцам, які быў усталяваны ў Рубяжэвічах у 1940 годзе, а затым знішчаны фашыстамі ў Вялікую Айчынную вайну і аказаўся забытым у пасляваенны час, – чарговы гісторыка-мемарыяльны праект, які цяпер абдумваюць Рамуальда Ігнатаўна і Тадэвуш Люцыянавіч.

***

У народзе кажуць: чалавек, адарваны ад сваёй гісторыі, культуры, традыцый – што дрэва без каранёў. І нідзе ад яго карысці людзям не будзе. Рамуальда і Тадэвуш Сабалеўскія – зусім іншы прыклад. Яны дзе нарадзіліся, там і згадзіліся. Іх адданасці роднай вёсцы, а найперш рупнасці па адраджэнні і захаванні гістарычнай мінуўшчыны сваёй малой радзімы, можна толькі шчыра пазайздросціць.

– Жыццё кароткае. І так хочацца паспець нешта патрэбнае зрабіць! Гісторыя ж малой радзімы – гэта тое, што дапамагае ўратаваць памяць, якая ў сваю чаргу і робіць з нас людзей, – зазначае пры развітанні Рамуальда Ігнатаўна.

І з гэтымі словамі нельга не пагадзіцца.

**Сяргей ЖОЛУД**

**Мінск – Рубяжэвічы – Мінск**

**Фота аўтара**